ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_______________ У.У.Рыжкоў
___ _______________ 2016 год

Дата правядзення экзамену: 15 чэрвеня 2016 года

Час выканання работы: 45 хвілін

**Тэкст дыктанта і граматычнае заданне**

**для правядзення ўступнага экзамену**

**ў 10 клас ліцэя**

Дыктант

Лясныя сцежкі

Лясныя сцежкі… Яны заўсёды прыемныя і загадкавыя, а часам нават таямнічыя. Не кожнаму паказвае лес дарогу да сваіх патаемных скарбонак. Усё залежыць ад чалавека. Ідзе адзін і нічога асаблівага вакол сябе не заўважае. Дрэвы як дрэвы, трава як трава. А другі, ідучы той жа сцежкай, убачыць куды больш. Толькі трэба прыгледзецца ўважлівей, і яму ахвотна раскрые лес сваю душу.

Назіраючы за тым, што адбываецца вакол, чалавек заўважае шмат. І вавёрку, што прытаілася на суку. І выбітыя на бярозцы маленькія дзірачкі, з якіх ласуецца салодкім сокам дзяцел. А гляне на мурашнік – вызначыць надвор’е на бліжэйшы час. Тонкі назіральнік, ён разумее, ад чаго гучна застагнала старая хваіна, чаму схіліліся галінкі стромкай яліны. Ён дакладна вызначыць, хто гэтак гучна пракрычаў дзесьці ў самым зарасніку.

Чалавек разумее лес, і лес разумее яго. Напоіць сокам і схавае ад дажджу, дасць адпачыць у прахалодзе дрэў і накорміць ляснымі дарамі-ласункамі. (145 слоў)

*Паводле В.Грамыкі.*

Граматычнае заданне

1. Выпішыце з тэксту фразеалагізм, пісьмова патлумачце яго значэнне.
2. Выпішыце з тэксту тры словы, вымаўленне і напісанне якіх не супадае. Пісьмова патлумачце, чым абумоўлена гэта несупадзенне.
3. Выпішыце з тэксту складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі і зрабіце яго сінтаксічны разбор.